ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1986

13 ЛЮТАГА ЧАЦВЕР № 5(1491)

ВЫДАЕЦЦА З 1922 ГОДА

XXVII з'езду КПСС — нашы здабыткі, натхнёная праца, выдатная вучоба, майстэрства і пошук!

Беларускі універсітэт

ТЭЛЕТАЙП

УЧОРА · СЁННЯ · ЗАЎТРА

СЁННЯ

ва ўсіх падраздзяленнях пройдзе адзіны палітдзень. Яго тэма — «Ад з'езда да з'езда».

В. ЮРКІНА.

МАТЭРЫЯЛЫ XXX З'ЕЗДА КПБ

глыбока вывучаюцца выкладчыкамі і студэнтамі БДУ. Для вызначэння задач калектываў у святле рашэнняў XXX з'езда КПБ партыйнымі, прафсаюзнымі, камсамольскімі і іншымі грамадскімі арганізацыямі ў лютым будуць праведзены наступныя мерапрыемствы: палітінфармацыі, лекцыі, гутаркі, сустрэчы студэнтаў і супрацоўнікаў з дэлегатамі з'езда. Матэрыялы з'езда будуць выкарыстоўвацца ў лекцыйных курсах і на практычных занятках, пры напісанні курсавых і дыпломных работ. У бібліятэках будуць аформлены выстаўкі і стэнды дапаможнай літаратуры. Для замежных студэнтаў будуць арганізаваны пасяджэнні палітычных дыскусійных клубаў. Перад насельніцтвам горада і рэспублікі выступяць дакладчыкі з ліку выкладчыкаў БДУ.

А. ДЗЯДОК, студэнт факультэта журналістыкі.

ПАДВЕДЗЕНЫ ВЫНІКІ

сацыялістычнага спаборніцтва за 1985 год паміж інтэрнатамі універсітэта за права называцца ўзорнымі. Першае месца прысуджана калектыву інтэрната № 4, другое — калектыву інтэрната № 2, трэцяе — калектыву інтэрната № 7. Пераможцы будуць узнагароджаны ганаровымі граматамі і каштоўнымі падарункамі.

П. ЛАПЦЁНАК, намеснік старшыні студэнцкага прафкома.

ФАКУЛЬТЭТ ПАВЫШЭННЯ КВАЛІФІКАЦЫІ

выкладчыкаў грамадскіх дысцыплін сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў пачаў свае заняткі. У гэтым годзе кваліфікацыю павысяць выкладчыкі не толькі нашай рэспублікі, але і Прыбалтыкі, Малдавіі, Туркменіі. Асноўная ўвага звяртаецца на вывучэнне матэрыялаў XXVII з'езда КПСС.

Т. НАВАДВОРСКАЯ.

КАМСАМОЛЬСКІМ ВОПЫТАМ

работы абмяняліся актывісты Яраслаўскага універсітэта і БДУ. Для гасцей былі арганізаваны экскурсіі на мемарыяльны комплекс «Хатынь», Курган Славы, па гораду-герою Мінску.

Т. РУДКОЎСКАЯ.

СА СПРАВАЗДАЧНЫМ КАНЦЭРТАМ

у Палацы культуры тэкстыльшчыкаў выступілі народны ансамбль танца «Крыжачок» і дзіцячы танцавальны ансамбль «Крынічанька».

М. ТАРАСАВА, мастацкі кіраўнік студклуба.

Працу ўвенчвае ўзнагарода

13 лютага адбудзецца канферэнцыя працоўнага калектыву універсітэта, якая падвядзе вынікі сацыялістычнага спаборніцтва за 1985 год і адзінаццатую пяцігодку.

На канферэнцыі будзе ўручаны пераходны Чырвоны сцяг МінВНУ СССР і ЦК прафсаюза работнікаў асветы, вышэйшай школы і навуковых устаноў, які заваяваў калектыў універсітэта па выніках сацыялістычнага спаборніцтва ў 1985 годзе.

ТАК ТРЫМАЦЬ!

ВІНШУЕМ З ПЕРАМОГАЙ!

6 ЛЮТАГА 1986 года адбылося пасяджэнне агульнаўніверсітэцкай камісіі па сацыялістычнаму спаборніцтву.

Па выніках сацыялістычнага спаборніцтва ў 1985 годзе паміж факультэтамі, кафедрамі і іншымі падраздзяленнямі універсітэта пераможцамі прызнаны наступныя факультэты, кафедры і падраздзяленні:

ФІЗІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ;

ФАКУЛЬТЭТ РАДЫЁФІЗІКІ І ЭЛЕКТРОНІКІ;

ФАКУЛЬТЭТ ПРЫКЛАДНОЙ МАТЭМАТЫКІ;

КАФЕДРА МАРКСІСЦКА-ЛЕНІНСКАЙ ФІЛАСОФІІ ГУМАНІТАРНЫХ ФАКУЛЬТЭТАЎ;

КАФЕДРА АНГЛІЙСКАЙ МОВЫ ПРЫРОДАЗНАЎЧЫХ ФАКУЛЬТЭТАЎ;

ЛАБАРАТОРЫЯ ЭКСТРАКЦЫЙНЫХ І САРБЦЫЙНЫХ ПРАЦЭСАЎ НДІ ФХП;

ЛАБАРАТОРЫЯ АЎТАМАТЫЗАВАНЫХ НАВУЧАЛЬНЫХ СІСТЭМ НДІ ПФП ІМЯ А. Н. СЕЎЧАНКІ;

АДДЗЕЛ № 30 СКТБ;

СЕКТАР ПРЫКЛАДНОЙ СТАТЫСТЫКІ ВЫЛІЧАЛЬНАГА ЦЭНТРА.

ВЫЛУЧАНЫ НА АТРЫМАННЕ ДЗЯРЖАЎНАЙ ПРЭМІІ БССР

ПЛЁН ТВОРЧАГА КАЛЕКТЫВУ

КРАСАВІЦКІ (1985 г.) Пленум ЦК КПСС вызначыў абгрунтаваную праграму паскарэння сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны на базе навукова-тэхнічнага прагрэсу. Пры гэтым сучасная тэхналогія, якая ляжыць у аснове паляпшэння якасці і выкарыстання матэрыялаў для разнастайных галін прамысловасці, з'яўляецца асноўным звяном навукова-тэхнічнага прагрэсу і служыць умовай павышэння эфектыўнасці народнай гаспадаркі.

ПРЫНЦЫПОВА новымі і прагрэсіўнымі тэхналогіямі, якія забяспечваюць рэзкае (у 2—5 разоў) паляпшэнне якасцей матэрыялаў і вырабаў, з'яўляюцца працэсы, якія распрацаваны супрацоўнікамі кафедры фізікі цвёрдага цела на аснове метадаў іонна-прамянёвай апрацоўкі. Выкарыстанне распрацаваных працэсаў для мадыфікацыі структуры і якасцей матэрыялаў, сінтэзу новых матэрыялаў і нанясення тонкаплёначных пакрыццяў дазволіць забяспечыць максімальны эфект паляпшэння якасцей канкрэтных вырабаў.

З мэтай комплекснай распрацоўкі для выкарыстання на практыцы прапанаваных метадаў створаны творчы калектыў у саставе Белдзяржуніверсітэта, Беларускага рэспубліканскага НВА парашковай металургіі і шэрагу ўстаноў Мінздрава БССР. Размеркаванне абавязкаў паміж асобнымі арганізацыямі вызначана дагаворам аб навукова-тэхнічным супрацоўніцтве. Гэты калектыў з'яўляецца правобразам міжгаліновага навукова-тэхнічнага комплексу (цэнтра), неабходнасць стварэння якога падкрэслівалася ў апублікаванай у снежні 1985 года Пастанове ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР.

У выніку выканання ў 1981—1985 гг. навукова-даследчых і вопытна-канструктарскіх работ былі распрацаваны новыя тэхналагічныя працэсы і створана абсталяванне для нанясення тонкаплёначных пакрыццяў.

Укараненне вынікаў НДР у народную гаспадарку БССР дазволіла: павысіць хімічную стойкасць і палепшыць медыка-біялагічныя характарыстыкі стальных зубных пратэзаў пры нанясенні пакрыццяў, якія імітуюць колер золата; удасканаліць нанясенне светаахоўных пакрыццяў з рознымі колера-аптычнымі характарыстыкамі на вырабы медыцынскай оптыкі; умацаваць рэжучы інструмент і медыцынскі інструментарый і павялічыць у 2—5 разоў яго трываласць і даўгавечнасць. Агульны эканамічны эфект ад укаранення вынікаў работы за XI пяцігодку склаў 10 мільёнаў рублёў.

Улічваючы значны ўклад, які ўнеслі ўдзельнікі творчага калектыву ў рашэнне народнагаспадарчай праблемы, работа «Распрацоўка і стварэнне новых тэхналагічных працэсаў і абсталявання для нанясення тонкаплёначных пакрыццяў метадам іонна-прамянёвай апрацоўкі і іх шырокае ўкараненне ў народную гаспадарку Беларускай ССР» заслужана вылучана на атрыманне Дзяржаўнай прэміі БССР 1986 года. У састаў аўтарскага калектыву ад Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна вылучаны загадчык кафедры фізікі цвёрдага цела, заслужаны дзеяч навукі і тэхнікі БССР, прафесар У. П. Гольцаў.

А. СЕРАФІМОВІЧ, старшыня вытворча-масавай камісіі прафкома.

НА ЗДЫМКУ: ступрацоўнікі кафедры фізікі цвёрдага цела. Фота А. ВАЛОШЫНА.

ПЕРАМОЖЦА САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА СПАБОРНІЦТВА

Калектыў сектара прыкладной статыстыкі вылічальнага цэнтра.
Фота А. ВАЛОШЫНА.

ФІЗФАК — ПЕРАМОЖЦА СПАБОРНІЦТВА

НА НОВЫЯ РУБЯЖЫ!

За XI пяцігодку фізічны факультэт дабіўся бясспрэчных поспехаў. Выкладчыкамі і супрацоўнікамі факультэта апублікавана больш як 1800 работ, у тым ліку 9 манаграфій, 7 падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў. Атрымана 195 аўтарскіх пасведчанняў на вынаходніцтвы. Эканамічны эфект ад НДР склаў за пяцігодку больш як 17 мільёнаў рублёў. Гэта звыш 2 рублёў на адзін рубель выдаткаў!

СУПРАЦОЎНІЦТВА факультэта з вядучымі прадпрыемствамі дазваляе ўкараняць у прамысловасць распрацоўкі кафедраў. У нас ёсць добрыя прыклады. Напрыклад, у XI пяцігодцы на ВА «Інтэграл» былі ўкаранёны 2 вынаходніцтвы супрацоўнікаў кафедры фізічнай оптыкі і НДІ ПФП з гадавым эканамічным эфектам больш як 150 тысяч рублёў. Расходамер і гамашчыльнамер, распрацаваныя на кафедры ядзернай фізікі, укаранёны ў Мінаўтатрансе БССР і на Мінскім заводзе халадзільнікаў.

Многія поспехі звязаны з супрацоўніцтвам з вытворчымі і галіновымі НДІ. Мы выкарыстоўваем іх майстэрні і ўнікальнае абсталяванне, іншы раз нам перадаюць некаторыя ўстаноўкі на баланс. Далейшая сувязь з вытворчымі, галіновымі НДІ і НДІ АН БССР дапаможа дасягнуць яшчэ большых вынікаў у навуцы.

Дэканатам распрацаваны комплексны план па аказанню дапамогі сярэдняй школе, з якой мы працуем у цеснай узаемасувязі. Яна адлюстроўваецца і ў правядзенні лекцый, алімпіяд, і ў дапамозе інстытутам удасканалення настаўнікаў, і ў прафарыентацыйнай рабоце. Аднак маецца шэраг пралікаў: мы пакуль не распрацавалі задачнікаў і не стварылі дапаможнікаў для сярэдняй школы, няма і лабараторных практыкумаў.

Увядзенне ў школьную праграму курса «Асновы інфарматыкі і вылічальнай тэхнікі» ставіць перад калектывамі ВНУ новыя праблемы. Яны звязаны не толькі з падрыхтоўкай настаўніцкіх кадраў, здольных вырашаць складаныя пытанні ва ўмовах рэалізацыі рэформы агульнаадукацыйнай школы, але і з задачамі прыёму і падрыхтоўкі кантынгентаў учарашніх школьнікаў, падрыхтаваных школай пановаму. Пры гэтым ВНУ не павінны следаваць за школай, а дапамагаць ёй у рашэнні пастаўленых задач. Факультэтам ужо зроблена шмат. Ёсць кадры, ёсць некаторы парк вылічальнай тэхнікі. У сучасны момант усе кафедры працуюць над методыкай лекцыйных курсаў, значная ўвага надаецца ўмацаванню светапоглядной накіраванасці курсаў.

У 1979 годзе з 10 загадчыкаў кафедраў прафесараў было ўсяго чатыры. На факультэце працавала 58 кандыдатаў навук, 7 дактараў навук. У цяперашні час з 11 загадчыкаў кафедраў — 2 акадэмікі, 5 прафесараў, 4 кандыдаты навук. Праз 2—3 гады ў нас усімі кафедрамі будуць загадваць доктары навук. За XI пяцігодку абаронена 4 доктарскія дысертацыі, 68 кандыдацкіх. 80 выкладчыкаў маюць ступені кандыдатаў навук, пры гэтым больш за 10 э іх паспяхова працуюць над доктарскімі дысертацыямі.

Фізічны факультэт, ідучы насустрач XXVII з'езду КПСС, выступіў са зваротам да ўсіх факультэтаў пад дэвізам «Кожную навуковую распрацоўку — на ўзровень новых патрабаванняў навукова-тэхнічнага прагрэсу». Высокая адказнасць усяго калектыву патрабуе пошуку эфектыўных шляхоў ажыццяўлення дэвізу ў рэальныя вынікі.

Э. ШПІЛЕЎСКІ,
дэкан фізічнага факультэта, дацэнт.

ПАСКАРЭННЕ НАВУКОВА-ТЭХНІЧНАГА ПРАГРЭСУ — ПАТРАБАВАННЕ ЧАСУ

У 1985, завяршаючым годзе XI пяцігодкі, калектыў Беларускага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна, кіруючыся гістарычнымі рашэннямі партыі і ўрада па пытаннях вышэйшай школы і павышэння эфектыўнасці НДР, дасягнуў значных поспехаў у падрыхтоўцы высококваліфікаваных кадраў, у развіцці навукова-даследчай работы. Дзейнасць супрацоўнікаў была накіравана на павышэнне ўзроўню і рэзультатыўнасці НДР, паскарэнне ўкаранення навуковых дасягненняў у народную гаспадарку краіны і рэспублікі.

НАКІРАВАНАСЦЬ У ЗАЎТРА

НАВУКОВЫЯ напрамкі дзейнасці універсітэта вызначаны ў адпаведнасці з профілем падрыхтоўкі спецыялістаў, таму што актыўны ўдзел прафесарска-выкладчыцкага саставу, аспірантаў і студэнтаў у навуковых даследаваннях з'яўляецца адным з важнейшых фактараў павышэння іх кваліфікацыі. З 468 тэм навукова-даследчых работ выконвалася па важнейшай тэматыцы 400. Універсітэт удзельнічаў у 74 саюзных і рэспубліканскіх праграмах. Было ўкаранёна ў народную гаспадарку 212 і ў вучэбны працэс 237 работ. Эканамічны эфект ад укаранення НДР склаў 23,5 мільёна рублёў. Атрымана 242 станоўчыя рашэнні на выдачу аўтарскіх пасведчанняў. Надрукавана 325 работ, з іх — 67 манаграфій, 178 падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў, 37 зборнікаў навуковых работ, апублікавана 3786 артыкулаў. Дасягненні калектыву універсітэта прадстаўлены ў 72 экспазіцыях на ВДНГ БССР, міжнародных і іншых выстаўках, атрымана 51 узнагарода.

Адзначым найбольш значныя работы, якія былі выкананы за апошнія гады ва універсітэце і ўкаранёны ў народную гаспадарку.

У галіне навуковага прыладабудавання праведзены даследаванні, якія звязаны з распрацоўкай аптычных, оптаэлектронных, ядзернааптычных, радыёаптычных і радыёэлектронных сродкаў вывучэння фізічных працэсаў і з'яў. Даследаванні ў гэтых напрамках удастоены дзвюх Дзяржаўных прэмій БССР.

У НДІ ПФП распрацаваны і створаны лідарныя станцыі для дыстанцыйнага вызначэння аэразольных забруджванняў атмасферы лазерна-лакацыйным метадам. Іх выкарыстанне пазбаўляе ад працаёмкіх вымярэнняў чысціні атмасфернага паветра з дапамогай радыёзондаў. Створаная апаратура выкарыстоўвалася пры даследаванні паветраных басейнаў развітых прамысловых гарадоў краіны і рэспублікі, а таксама біясферных запаведнікаў. З дапамогай гэтых станцый атрыманы і выкарыстаны для рашэння горадабудаўнічых і санітарна-гігіенічных задач вялікага маштабу картасхемы аэразольных забруджванняў. Стацыянарная ўстаноўка, якая знаходзіцца ў вопытна-вытворчай эксплуатацыі, забяспечвае пастаяннае сачэнне за якасцю паветра ў Мінску.

У НДІ ПФП і на кафедры электронных матэматычных машын распрацавана аўтаматызаваная навучальная сістэма АТНС-БДУ. Дзякуючы сваім дыдактычным перавагам і эканамічнасці сістэма ўкаранёна ў вучэбны працэс шэрагу ВНУ краіны.

На кафедры фізікі паўправаднікоў распрацаваны спектрометр «Мінск-12М». Спектрометр выкарыстоўваецца ў арганізацыях МінВНУ СССР, АН СССР, МінВНУ БССР і АН БССР.

На кафедры ядзернай фізікі выкананы комплекс навукова-даследчых і тэхналагічных распрацовак, якія накіраваны на развіццё метадаў магнітна-рэзанансной і гама-рэзанансной спектраскапіі прымяняльна для рашэння важнейшых народнагаспадарчых задач.

Распрацаваная ў НДІ ФХП і на хімічным факультэце тэхналогія электрахімічнай апрацоўкі вырабаў з алюмінію і яго сплаваў дазваляе афарбаваць паверхню вырабаў у трывалыя да сонечнай радыяцыі і атмасферных з'яў разнастайныя колеры, істотна палепшыць ахоўныя і тэхнічныя ўласцівасці пакрыцця. Укараненне прапануемай тэхналогіі ў вытворчасць не патрабуе грунтоўных капіталаўкладанняў і плошчаў. У сучасны момант спосаб выкарыстоўваецца на ВА «Інтэграл» пры вырабе карпусоў гадзіннікаў «Электроніка» і на ВА «Гарызонт» пры стварэнні радыёпрыёмнікаў.

Зроблена шмат, але ў XII пяцігодцы перад намі стаяць новыя вялікія задачы.

Павышэнню эфектыўнасці работы кожнага спецыяліста будзе садзейнічаць пераход у 1986 годзе на новую сістэму аплаты працы навуковых супрацоўнікаў. Гэта мера заклікана павысіць грамадскае прызнанне навуковай працы, узмацніць у ёй творчы пачатак, стымуляваць якаснае выкананне работ з меншай колькасцю супрацоўнікаў.

Трэба стварыць неабходныя ўмовы для творчай працы. Забяспечыць кафедры, лабараторыі навейшым абсталяваннем, прыладамі, сучаснай вылічальнай тэхнікай, неабходнымі матэрыяламі, пабудаваць сучасныя навукова-вучэбна-лабараторныя будынкі.

Не маючы юрыдычнай магчымасці актыўна ўплываць на прадпрыемства ці галіну, дзе прадугледжваецца ўкараніць вынікі даследаванняў, універсітэт адчувае шэраг складанасцей, якія звязаны з выкарыстаннем навуковых дасягненняў у народнай гаспадарцы. Вядома таксама аб адсутнасці зацікаўленасці супрацоўнікаў галіновых НДІ пры ўкараненні распрацовак, якія выкананы ў ВНУ без іх удзелу. Неабходна прадугледзець у дырэктыўным парадку абавязкі і юрыдычную адказнасць заказчыка гаспадарча-дагаворных работ (ведамстваў, прадпрыемстваў, арганізацый) за ўкараненне распрацовак ВНУ. Узрастаючыя аб'ёмы ўкаранення навуковых дасягненняў ВНУ ў вытворчасць патрабуюць вядомай заканадаўчай рэгламентацыі.

Ідучы насустрач XXVII з'езду КПСС, калектыў універсітэта накіраваны ў заўтра. Іменна там, на парозе XXI стагоддзя нас чакаюць новыя адкрыцці і здзяйсненні тых, хто сёння толькі ўпершыню пераступіў прыступку універсітэцкай аўдыторыі, каму працягваць эстафету слаўных працоўных спраў старэйшага пакалення, памнажаць лепшыя традыцыі старэйшай ВНУ рэспублікі. Іменна ў гэтай пераймальнасці мы бачым сённяшнія і будучыя рубяжы універсітэцкай навукі.

М. КАЗЛОЎСКІ,
намеснік прарэктара па навуковай рабоце, дацэнт.

Саветам па навукова-даследчай рабоце студэнтаў падведзены вынікі агляду-конкурсу на лепшы факультэт па пастаноўцы навукова-даследчай работы студэнтаў. Першае месца заняў факультэт радыёфізікі і электронікі. На другім — фізічны факультэт, на трэцім — факультэт прыкладной матэматыкі.

СТУДЭНТ І НТП

ШЫРАЦЦА РАДЫ

ВЫНІКІ агляду-конкурсу паказалі, што цікавасць да навуковай работы ў студэнтаў узрастае. Ёсць нямала якасных змен у арганізацыі НДРС. Даследаванні ў асноўным вядуцца па рэальнай тэматыцы. Вялікая ўвага надаецца пазавучэбным формам НДРС. За справаздачны год усімі формамі НДР было ахоплена 5450 студэнтаў дзённай формы навучання. Каля 2000 удзельнічалі ў выкананні тэматычнага плана НДР, з іх 277 працавалі па гаспадарча-дагаворнай тэматыцы на ўмовах штатнага сумяшчальніцтва.

Па выніках НДР студэнтамі самастойна і ў сааўтарстве было надрукавана 300 артыкулаў і дакладаў, атрымана 14 станоўчых рашэнняў на выдачу аўтарскіх пасведчанняў. На ВДНГ СССР і БССР з актыўным удзелам студэнтаў дэманстравалася 8 экспанатаў, тры з якіх былі адзначаны медалямі. На розных канферэнцыях студэнты выступілі з 4000 дакладаў. 148 студэнтаў адзначаны ў 1985 годзе ўзнагародамі на конкурсах студэнцкіх навуковых работ, выстаўках навукова-тэхнічнай творчасці моладзі.

Вялікая ўвага надавалася далучэнню студэнтаў да конкурсаў па грамадскіх навуках, гісторыі ВЛКСМ і міжнароднага маладзёжнага руху. У першым туры XI Усесаюзнага конкурсу прыняў удзел практычна кожны студэнт.

А. НІКІЦЕНКА.

ЭНТУЗІЯЗМ+?=СНВА

Камітэт камсамола фізічнага факультэта лічыць усебаковае развіццё і павышэнне эфектыўнасці НДР студэнтаў сваёй ударнай справай, таму надае вялікую ўвагу развіццю і распаўсюджанню новых форм даследчай работы студэнтаў, у прыватнасці, арганізацыі СНВА.

Але, на жаль, пэўных нарматыўных дакументаў, якія б рэгламентавалі юрыдычную аснову работы студэнцкіх навукова-вытворчых атрадаў (СНВА), пакуль яшчэ няма. Правобразы такіх атрадаў фактычна ўжо маюцца на кафедрах ядзернай фізікі і фізікі паўправаднікоў. Дасягнута дамоўленасць з кіраўніцтвам ВА «Інтэграл» аб стварэнні СНВА на яго базе. Усё гэта пакуль робіцца на аснове энтузіязму, якая, на жаль, не заўсёды трывалая. Знаёмства з вопытам работы (калі можна яго гэтакім назваць — настолькі ён малы) маскоўскіх ВНУ не праліло святла на рашэнне праблемы статуса СНВА, якія іншы раз безнадзейна затрымліваюць добрае пачынанне.

Вялікае значэнне мы надаем і традыцыйным формам і метадам работы, у прыватнасці, ускладаем вялікія надзеі на СНДЛ. Магчыма, прыйшоў час мэтазгоднасці заключэння невялікіх дагавораў для студэнцкіх навукова-даследчых лабараторый з вытворчымі прадпрыемствамі і НДІ. На наш погляд, такая форма даследчай работы студэнтаў вельмі перспектыўная і перагукаецца з дзейнасцю СНВА. Зараз вядзецца работа па стварэнню новай СНДЛ на факультэце на базе кафедры спектраскапіі і квантавай электронікі.

Камітэт камсамола фізфака асаблівую ўвагу звяртае і на развіццё творчых сувязей з камітэтамі камсамола нашых базавых прадпрыемстваў і іншых навукова-даследчых арганізацый, дзе працуюць выпускнікі фізфака. Таму немалаважнае значэнне мае заключэнне дагавораў аб садружнасці, у тым ліку, і навукова-тэхнічным. Адзін такі дагавор на XII пяцігодку паміж камітэтам камсамола фізфака і камітэтам камсамола АН БССР і СКТБ ужо заключаны.

Мы рэальна ацэньваем сітуацыю, якая склалася на факультэце, і добра разумеем, што работа па актывізацыі даследчай дзейнасці студэнтаў чакаецца вялікая, яна патрабуе актыўнай пазіцыі кожнага камсамольца. Ад тых, хто цяпер яшчэ вучыцца ў ВНУ, хто хутка атрымае пуцёўку ў самастойнае жыццё, у многім залежыць паскарэнне навукова-тэхнічнага прагрэсу краіны.

І. ГАНЧАРОНАК.

«КАНСТРУКТАРЫ» З МІКРАСВЕТУ

ГІПОТЭЗЫ — ПОШУКІ — АДКРЫЦЦІ

Метад, распрацаваны вучонымі НДІ ПФП імя А. Н. Сеўчанкі з ужываннем іоннай імплантацыі, дае магчымасць змяняць фізіка-хімічныя ўласцівасці любога рэчыва, і таму ён шматбакова і надзвычай эфектыўна прымяняецца ў практыцы. Новыя знаходкі вучоных — гэта новыя крокі ў развіцці мікраэлектронікі, аднаго з дзейсных рычагоў навукова-тэхнічнага прагрэсу.

КОЖНАМУ, мабыць, вядома, што па скорасці выканання лічбавых аперацый электронны мозг апярэджвае чалавечы. Хуткадзеянне электронных вылічальнікаў першага пакалення ацэньвалася ў 5 тысяч аперацый у секунду. Транзістары і пячатаныя платы, якія прыйшлі на змену электроннай лямпе, узнялі гэты паказчык да 200 тысяч, а ў камп'ютэраў трэцяга пакалення ён склаў 2 мільёны. Цяперашняе, чацвёртае пакаленне, якое базіруецца на мікрапрацэсарах і вялікіх інтэгральных схемах, характарызуе ўжо ашаламляльная велічыня — 100 мільёнаў! Што датычыць машын пятага пакалення, мяркуюць, яны з'явяцца ў пачатку наступнага дзесяцігоддзя,— то аператыўнасць іх павялічыцца яшчэ ў... тысячу разоў.

Каб дасягнуць такой пакулі што фантастычнай лічбы, трэба павысіць ступень інтэграцыі мікрасхемы, іншымі словамі, павялічыць колькасць элементаў на ёй — транзістараў, дыёдаў, рэзістараў. Сёння гэта адзін са стратэгічных напрамкаў развіцця мікраэлектронікі, у якой, дарэчы, навука прадэманстравала ўжо нам свае гіганцкія магчымасці. Інтэгральная мікрасхема цяпер — гэта невялічкі, з гарошынку, крышталік крэмнію. Не было б такіх малюсенькіх мікрасхем, многія б віды сучаснай электроннай тэхнікі — ЭВМ, робаты, разнастайныя аўтаматы і аўтаматычныя лініі, нарэшце, касмічныя караблі — сталі б проста безжыццёвым металам. А між тым у састаў адной такой мікрасхемы ўваходзяць сотні тысяч элементаў. Аднак для таго, каб стварыць, напрыклад, тую ж ЭВМ пятага пакалення, ужо і іх недастаткова — патрабуецца ў сотні разоў больш.

Шляхі павышэння ступені інтэграцыі мікрасхем розныя. Адзін з іх — павелічэнне размераў самога крышталя крэмнію, на якім яны фарміруюцца. Аднак тут неабходна пераадолець перашкоды тэхналагічнага характару. Самы нязначны дэфект з-за мініяцюрнасці асобных элементаў інтэгральных мікрасхем здольны вывесці яе са строю. Зразумела, чым большы размер крышталя, тым большая верагоднасць атрымаць бракаваную мікрасхему.

Якім жа чынам можна пазбавіцца ад дэфектаў — таямнічых і каварных ворагаў мікрасхемы? Ёсць розныя спосабы. Ды справа ў тым, што ўсе яны маюць адзін і той жа асноўны недахоп — не застрахоўваюць ад з'яўлення дэфектаў у час тэхналагічных аперацый. Каб не дапусціць іх у працэсе вытворчасці мікрасхем, рэгламентуюць нават насычанасць і размер пылінак на ўчастку, выкарыстоўваюць асабліва чыстыя матэрыялы і тэхналагічную аснастку. На жаль, і гэта не дапамагае. Знайсці выхад з падобнага «зачараванага кола» — значыць знайсці такое тэхнічнае рашэнне, якое гарантавала б поўнасцю бездэфектны цыкл вырабу інтэгральных мікрасхем — ад пачатку і да канца.

Прапанавалі яго вучоныя Навукова-даследчага інстытута прыкладных фізічных праблем імя А. Н. Сеўчанкі. У аснову пакладзен метад іоннай імплантацыі. Крэмневыя пласцінкі апрацоўваюцца такім спосабам перад іх выкарыстаннем, пасля чаго дэфекты знікаюць і больш не з'яўляюцца. Перавага яго і ў тым, што няма неабходнасці нешта змяняць у тэхналогіі вытворчасці мікрасхем. Ён, па сутнасці, універсальны і таму можа прымяняцца пры вырабе любых іх відаў.

Першая доследна-прамысловая праверка новага метаду паказала яго высокую эфектыўнасць — выхад прыгодных мікрасхем на крышталях крэмнію павялічыўся ў два разы. Разам з тым прыкметна знізілася працаёмкасць іх вырабу. І галоўнае — эканамічна выгадным стаў выпуск мікрасхем з большым размерам крышталя. Такім чынам была вырашана задача павышэння ступені іх інтэграцыі, што адкрыла шырокія практычныя перспектывы.

Вучоныя НДІ прыкладных фізічных праблем імя А. Н. Сеўчанкі першыя ў краіне распрацавалі метады матэматычнага мадулявання для асноўных тэхналагічных аперацый вытворчасці вялікіх і звышвялікіх інтэгральных мікрасхем, якія паспяхова выкарыстоўваюцца сёння на практыцы.

Якія ж каштоўныя перспектывы адкрывае метад іоннай імплантацыі? Знайсці адказ на гэта пытанне было няцяжка, бо сёння яны ўжо відавочныя.

Задачы стварэння ЭВМ будучага, пятага пакалення, для кіравання вытворчасцю і для гібкіх аўтаматызаваных сістэм патрабуюць ужо зусім новых навуковых і тэхналагічных падыходаў да вырабу звышвялікіх інтэгральных мікрасхем. Сёння вучонымі НДІ прыкладных фізічных праблем імя А. Н. Сеўчанкі распрацаваны навуковыя асновы абсталявання і тэхналагічныя прынцыпы выкарыстання высокаінтэнсіўных іонных пучкоў, якія дазволяць у адну аперацыю аб'яднаць некалькі. Гэта першая прыступка ў рэалізацыі шырокамаштабнай задачы прымянення іонных пучкоў, кіруемых ЭВМ, для нанясення элементаў мікрасхемы на крышталь без соцень іншых аперацый. Такім чынам, адкрываецца практычная магчымасць перайсці да поўнасцю аўтаматызаванай бязлюднай вытворчасці інтэгральных мікрасхем і прыбораў цвёрдацелай электронікі.

С. БУЛАЦКІ.

ПЕРАМОЖЦА САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА СПАБОРНІЦТВА



КАЛЕКТЫЎ лабараторыі экстракцыйных і сарбцыйных працэсаў. Намеснік загадчыка лабараторыі старшы навуковы супрацоўнік, кандыдат хімічных навук У. Ягораў, малодшы навуковы супрацоўнік Л. Каленка, малодшы навуковы супрацоўнік Т. Баршчынская, малодшы навуковы супрацоўнік У. Рэпін абмяркоўваюць вынікі эксперыментаў.

Фота А. ВАЛОШЫНА.

ФПМ — ПЕРАМОЖЦА СПАБОРНІЦТВА

РЭЗЕРВЫ — У ДЗЕЯННЕ

Працэс матэматызацыі ўсіх сфер народнай гаспадаркі запатрабаваў падрыхтоўкі высококваліфікаваных спецыялістаў, якія валодаюць тэхналогіяй прымянення ЭВМ. За гады сваёй работы факультэт прыкладной матэматыкі падрыхтаваў для народнай гаспадаркі больш трох тысяч матэматыкаў, здольных рашаць складаныя задачы, эфектыўна выкарыстоўваць для гэтай мэты электронна-вылічальную тэхніку. Калектыў супрацоўнікаў прыкладае шмат намаганняў, каб падрыхтоўка студэнтаў адпавядала самым высокім патрабаванням, якія прад'яўляюцца да спецыялістаў.

РАЗАМ з тым калектыў факультэта разумее, што маецца яшчэ шмат нявыкарыстаных рэзерваў. У прыватнасці, арганізацыя сацыялістычнага спаборніцтва на факультэце і кантроль за ходам выканання абавязацельстваў былі цалкам ускладзены на прафсаюзнае бюро, а адміністрацыя і грамадскія арганізацыі засталіся ў баку ад гэтай важнай справы.

Партыйнае бюро прааналізавала практыку арганізацыі і правядзення сацыялістычнага спаборніцтва, заслухала справаздачы грамадскіх арганізацый і прапанавала распрацаваць і прыняць новае палажэнне аб сацыялістычным спаборніцтве паміж падраздзяленнямі факультэта. Прызнана мэтазгодным разам з улікам колькасных паказчыкаў дзейнасці падраздзяленняў факультэта прымаць да ўвагі асобныя значныя дасягненні падраздзяленняў, якія не падлягаюць адэкватнаму колькаснаму падліку.

Гэтыя меры дапамаглі палепшыць ход выканання прынятых факультэтам сацыялістычных абавязацельстваў. Актывізавалі сваю дзейнасць грамадскія арганізацыі, падраздзяленнямі факультэта былі арганізаваны навуковыя і навукова-метадычныя канферэнцыі, упершыню супрацоўнікамі атрыманы аўтарскія пасведчанні на вынаходніцтвы, значна палепшылася НДРС, з'явілася першая рацпрапанова ад студэнтаў. Эканамічны эфект склаў звыш 1 мільёна 300 тысяч рублёў.

Разам з тым мы поўнасцю ўсведамляем, што па шэрагу асабліва важных паказчыкаў, у тым ліку і па раздзелу павышэння кваліфікацыі супрацоўнікаў, калектыў займае адно з апошніх месц. Прычына гэтага відавочная: на факультэце няма абарон доктарскіх дысертацый, мала абараняецца кандыдацкіх дысертацый аспірантамі, мае месца дробнатэмнасць пры заключэнні гаспадарча-дагаворных работ, дрэнна выкарыстоўваюцца магчымасці больш багатага супрацоўніцтва з прадпрыемствамі Мінска. Гэтыя суб'ектыўныя недахопы мы яскрава бычым і накіроўваем усе намаганні на іх ліквідацыю.

Адначасова з гэтым на дзейнасці факультэта, безумоўна, адбіваюцца і некаторыя негатыўныя прычыны. Сярод іх, у першую чаргу, трэба адзначыць вастрэйшы недахоп вылічальнай тэхнікі. Парадаксальна, але факультэт аснашчаны ўсяго толькі 8 дысплеямі, якія падключаны да ЭВМ, што ні ў якой меры не адпавядае патрабаванням да электронна-вылічальных машын сённяшняга часу! Адсутнічаюць сучасныя персанальныя камп'ютэры. Адчуваецца пастаянны недахоп аўдыторнага фонду. А той, які ёсць, раскіданы ў некалькіх карпусах. Ды і самі аўдыторыі нярэдка аснашчаны такімі дошкамі, што праводзіць у іх заняткі і чытаць лекцыі цяжка нават самым вопытным выкладчыкам. А між тым з просьбай замяніць дрэнныя дошкі адміністрацыя факультэта не аднойчы звярталася да адпаведных службаў універсітэта. Усе гэтыя недахопы без усякага сумнення парушаюць нармальную дзейнасць факультэта і, зразумела, адмоўна уплываюць на якасць падрыхтоўкі спецыялістаў, якім у наш час надаецца асаблівае значэнне.

В. КОРЗЮК,
дэкан ФПМ, дацэнт.
В. ШАЛІМА,
старшыня прафбюро, дацэнт.

ПЕРАМОЖЦА САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА СПАБОРНІЦТВА

З добрымі вынікамі прыйшоў да фінішу XI пяцігодкі факультэт радыёфізікі і электронікі. На факультэце штогод выконвалася 16—17 дзяржбюджэтных і 27—30 гаспадарча-дагаворных НДР аб'ёмам каля 2 мільёнаў рублёў. 80 працэнтаў дзяржбюджэтных НДР каардынаваліся планамі і праграмамі АН БССР і СССР. Кожная трэцяя гаспадарча-дагаворная НДР выконвалася ў інтарэсах прадпрыемстваў рэспублікі. Штогод эканамічны эфект ад укаранення распрацовак знаходзіўся ў межах 3—4,5 мільёна рублёў. Па выніках НДР факультэт займаў прызавыя месцы. У гэтым, вядома, адлюстроўвалася мабілізуючая роля сацыялістычнага спаборніцтва, арганізаванага ва універсітэце.

Галоўны рычаг

ПАКВАРТАЛЬНАЕ падвядзенне прамежкавых вынікаў сацыялістычнага спаборніцтва прымушала кафедры рытмічна працаваць на працягу ўсяго года. Вельмі добра, што з кожным годам удасканальваюцца некаторыя паказчыкі сацыялістычнага спаборніцтва ў сувязі з патрабаваннямі навукова-тэхнічнага прагрэсу.

Напрыклад, у пачатку пяцігодкі адным з паказчыкаў НДР была колькасць заявак на вынаходніцтвы, пададзеных за год. Затым вага гэтага паказчыка паменшылася, і ўзрасло значэнне колькасці атрыманых станоўчых рашэнняў. Прайшоў час, і найбольш важным паказчыкам стала колькасць вынаходніцтваў, укаранёных на прадпрыемствах рэспублікі і за яе межамі. Гэта адносіцца і да іншых паказчыкаў сацыялістычнага спаборніцтва па НДР. Такіх, як абарона доктарскіх і кандыдацкіх дысертацый, эканамічны эфект, Дзяржаўныя прэміі, напісанне артыкулаў, выступленні на канферэнцыях і г. д.

З году ў год лепшымі кафедрамі па НДР былі кафедры радыёфізікі, ЭММ, кібернетыкі, квантавай радыёфізікі. Заслуга тут і партыйных груп. і прафсаюзных арганізацый, якія змаглі мабілізаваць усіх супрацоўнікаў на выкананне сацыялістычных абавязацельстваў. Напрыклад, на кафедры кібернетыкі дзякуючы настойлівасці прафесара А. С. Міхалёва за гады пяцігодкі абаронена доктарская дысертацыя, атрымана Дзяржаўная прэмія. Толькі ў 1985 годзе супрацоўнікі кафедры падалі 21 заяўку на вынаходніцтвы. У вынаходніцкай дзейнасці ўдзельнічалі і студэнты.

Нашы некаторыя поспехі ў арганізацыі і выкананні дзяржбюджэтных і гаспадарча-дагаворных НДР, у арганізацыі навукова-даследчай работы студэнтаў з'яўляюцца вынікам мабілізуючай сілы сацыялістычнага спаборніцтва паміж кафедрамі і асобнымі супрацоўнікамі факультэта.

А. ШЫРОКАЎ,
дэкан факультэта радыёфізікі і электронікі, член-карэспандэнт АН БССР.

ПЕРАМОЖЦА САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА СПАБОРНІЦТВА

КАЛЕКТЫЎ кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі гуманітарных факультэта. Загадчык кафедры В. Е. Сцёпін, парторг Л. Ф. Кузняцова, вучоны сакратар А. М. Бобр абмяркоўваюць план прапаганды матэрыялаў XXX з'езда КПБ.

Фота А. ВАЛОШЫНА.



ТВАЕ ВЫКЛАДЧЫКІ, СТУДЭНТ

М. А. Мажэйка:

«У СТУДЭНТАХ БАЧУ СВАІХ КАЛЕГ!»

— ДОБРЫ ДЗЕНЬ! Будзем знаёмы! Марына Аляксандраўна Мажэйка, кандыдат філасофскіх навук, выконваючая абавязкі дацэнта кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі. Або проста — Марына.

Мы сядзім за адной партай («амаль як студэнтка»), гутарым. Гаварыць яна можа бясконца доўга, але ў той жа час бясконца захапляюча і шчыра. І расказваць, і пытаць яна ўмее, як кажуць, на адным дыханні, пра самае рознае, нават неверагоднае. Пра сябе ж сказала лаканічна:

— Звычайны чалавек, са звычайнай гісторыяй жыцця. Карацей, я — ваш сучаснік.

Так. Наш сучаснік. Усё ў яе біяграфіі звычайна. Знаёмы ланцужок: дзіцячы сад — школа — ВНУ — аспірантура. Згодны са мной? Ва ўсім дваццаціпяцігадовым станаўленні самае незвычайнае — улюбёнасць у прадмет філасофіі.

— Чаму гістарычны факультэт?

Марына Аляксандраўна ўдакладніла:

— Не гістарычны, а філасофіі.

Сёння я ўжо без філасофіі сябе не ўспрымаю. Банальна? Так. Але гэта праўда. І справа не толькі ў тым, што палажэнні дыямата і гістмата дапамагаюць канкрэтна ў жыцці разблытваць клубок дзён і спраў. Мне падабаецца строгасць, прынцыповасць, дысцыплінаванасць навукі і, ведаеце, апантанасць. Усё гэта — добрая падмога на жыццёвых скрыжалях.

«Табе семнаццаць, вырашай сама!» — з такім бацькоўскім наказам Марына расчыніла дзверы універсітэта. І цяпер, калі здараюцца непрыемнасці ў рабоце, родныя не ўмешваюцца.

— Ім за гэта ўдзячна. Мама лічыла мяне дарослай, калі я яшчэ была школьніцай. Самастойнасці і адказнасці за свае ўчынкі навучылася з дзяцінства.

Паміж навуковай работай і выкладаннем прадмета існуе і вольны час. Марыне Аляксандраўне падабаецца бываць у тэатры. Больш за ўсё любіць МХАТ. Але рэдка даводзіцца з ім сустракацца. Ні адных гастроляў тэатра ў Мінску не прапусціла («як студэнтка на лекцыях»), а калі даводзіцца бываць у Маскве, то візіт у МХАТ — абавязковы. Падабаецца выкладчыцы і тэатр імя Я. Купалы.

У студэнцкай аўдыторыі лёгка вызначыць, чаго каштуе праца ў бібліятэцы. Марына Аляксандраўна гэта разумее. Вось чаму зноў і зноў спяшаецца малады вучоны ў бібліятэку, чытае, занатоўвае думкі свае і думкі вялікіх папярэднікаў. Пачатак працы над «сваёй» тэмай звязаны з дыпломам. З ёй была звязана і дысертацыя, і выступленні на навуковых канферэнцыях. За распрацоўку пастаўленай праблемы Марына Аляксандраўна Мажэйка прызнана лаўрэатам Усесаюзнага конкурсу маладых вучоных. Цэлы раздзел у манаграфіі, якая выдаецца кафедрай, яна прысвяціла распрацоўцы сваёй тэмы.

А як жа студэнты? Яны ж таксама патрабуюць увагі. Увагі самаадданай, шчырай.

— У студэнце я бачу, перш за ўсё, свайго калегу, які ў самы бліжэйшы час можа стаць маім дарадчыкам. І мне з ім цікава. Не існуе для мяне мяжы паміж выкладчыкам і студэнтам. На час лекцый мы — адно цэлае, мы вырашаем праблему, мы шукаем ісціну. У філасофіі інакш нельга.

Успамінаецца адзін выпадак з практыкі.

Ішоў экзамен. Студэнт адказваў на «выдатна». Калі пацягнулася за залікоўкай — спыніў. «Спытайце мяне яшчэ»,— прапанаваў юнак. Задала пытанне. Адказаў. Ён зноў: «Задайце яшчэ!» Так і задавала яму пытанні амаль гадзіну. Зразумела Марына Аляксандраўна — праца яе марна не праходзіць. Не дзіўна, што пасля заняткаў студэнты-філосафы застаюцца з ёй, выкладчыкам, каб яшчэ і яшчэ пагаварыць пра навуку.

— Студэнт і навука — паняцці для мяне ўзаемадапаўняльныя. Калі чытаеш лекцыі — «адпачываеш» ад чыстай навукі, і наадварот, займаючыся распрацоўкай тэарэтычных пытанняў, адчуваеш палёгку ад «гаварэння». Шчаслівая я?.. Так. І нават вельмі. У мяне — сябры, у мяне — праца, на якую іду з адчуваннем свята. А яшчэ — турыстычныя паходы. Каго б я ўзяла з сабою ў турпаход? Членаў студэнцкага клуба «Філасофія і культура». З імі мне цікава. Спадзяюся, ім са мной таксама.

Не ўяўляю, што з Марынай Аляксандраўнай Мажэйка можа быць сумна.

І. КЕЗІК,
студэнтка факультэта журналістыкі.
Фота А. ВАЛОШЫНА.



МЫ — ІНТЭРНАЦЫЯНАЛІСТЫ

ЗАСТАНЁМСЯ СЯБРАМІ

Здаецца, яшчэ нядаўна Тэуфік Зарур вучыўся першым рускім словам: «мама», «мір»... І вось ужо надышоў час абароны кандыдацкай дысертацыі. На радзіме, у Сірыі, Тэуфік скончыў універсітэт, а ў аспірантуру паступаць прыехаў у Савецкі Саюз.

— Бадай, на ўсё жыццё запомню гасціннасць савецкіх людзей, іх шчырасць і добразычлівасць. Асабліва да нас, замежных грамадзян. Дзе б ні прыходзілася быць (а за час вучобы ў аспірантуры паездзіў па краіне нямала), сустракалі мяне нават зусім незнаёмыя людзі як дарагога госця.

На радзіме Тэуфік Зарур пасля заканчэння матэматычнага факультэта універсітэта некаторы час працаваў настаўнікам у школе.

— І менавіта ў той час, калі я вучыў дзяцей, зразумеў, наколькі важна, каб народы свету жылі ў міры. Зараз міжнародная абстаноўка вельмі напружаная. І каб забяспечыць дзецям мірную будучыню, веру ў заўтрашні дзень, мы павінны змагацца за мір ва ўсім свеце, мацаваць дружбу паміж народамі.

Студэнтка 2-га курса факультэта журналістыкі Райда Кохма — адна з першых дзяўчат, якія прыехалі з Сірыі ў нашу краіну на вучобу.

— Наш народ будуе новае грамадства, якое заснавана на роўнасці ўсіх людзей,— гаворыць яна.— Яшчэ нядаўна жанчына ў Сірыі была бяспраўнай, а зараз яе правы роўныя з правамі мужчыны. І тое, што я вучуся ў вышэйшай навучальнай установе краіны, якая ў ліку першых сацыялістычных дзяржаў працягнула нам руку дружбы, сведчыць аб павышэнні ролі жанчыны ў Сірыі ў грамадскім жыцці.

Пакуль у Белдзяржуніверсітэце імя У. І. Леніна вучацца толькі дзве сірыйскія дзяўчыны. Але гэта, як кажуць, першыя ластаўкі, сведкі пачатку тых перамен, якія адбываюцца ў Сірыі. І тое, што Райду Кохма выбралі старшынёй зямляцтва сірыйскіх студэнтаў, якія навучаюцца ў БДУ, не выпадкова.

— Вучоба, грамадская работа, мастацкая самадзейнасць займаюць багата часу,— працягвае Райда,— аднак паспяваю схадзіць у кіно і на выстаўкі, у музеі і тэатры. Асабліве маё захапленне — балет. Я ўбачыла ўжо многія пастаноўкі ў Беларускім дзяржаўным тэатры оперы і балета і яны мне літаральна паланілі. Мае пастаянныя экскурсаводы па беларускай сталіцы — таксама студэнткі факультэта журналістыкі, з якімі я жыву ў адным пакоі,— Святлана Высоцкая і Алена Рубанік.

Шмат даведалася Райда пра гістарычнае мінулае савецкага народа, моцна ўразілі, пакінулі незабыўны след у душы дзяўчыны экскурсіі ў Хатынь, на Курган Славы, у Брэсцкую крэпасць-герой.

Падабаецца ў нашай рэспубліцы студэнтам з Сірыі. «Мы назаўсёды застанёмся сябрамі». — такая іх аднадушная думка.

В. ГРАМОВІЧ.

ТВАЯ ГРАМАДЗЯНСКАЯ ПАЗІЦЫЯ

ЛЕКТАРАМ СТАНОВІЦЦА СТУДЭНТ

НА ВЕЧАРЫ выпускнікоў школы маладога лектара ў Белдзяржуніверсітэце імя У. І. Леніна студэнтцы 3-га курса механіка-матэматычнага факультэта Але Рыхловай разам з пасведчаннем аб заканчэнні школы быў уручаны білет члена Усесаюзнага таварыства «Веды». Яе выступленне па тэме «Ідэалагічная барацьба і моладзь» на ленінскай юбілейнай канферэнцыі, якая праводзіцца па традыцыі ўжо шмат гадоў запар ва універсітэце, пацвердзіла, што студэнтка — падрыхтаваны малады лектар. І прыемна, што А. Рыхлова стала актыўна выступаць па пуцёўках Мінскага абкома камсамола ў маладзёжных аўдыторыях.

У 1984—85 навучальным годзе школы маладога лектара ВНУ горада падрыхтавалі для прыёму ў члены таварыства «Веды» 205 студэнтаў. Але разам з тым праблема падрыхтоўкі лектарскіх кадраў з ліку моладзі ўсё яшчэ не вырашана. Дастаткова сказаць, што ў радах таварыства «Веды» Мінска толькі крыху больш 10 працэнтаў складаюць лектары ва ўзросце да 30 гадоў. Пытанне, як студэнту стаць лектарам, усё яшчэ застаецца актуальным. Таму школы маладога лектара сёння разглядаюцца як цэнтры падрыхтоўкі лектарскіх кадраў, з'яўляюцца адной з форм прыцягнення студэнтаў да прапаганды рашэнняў Камуністычнай партыі і Савецкага ўрада, палітычных і навуковых ведаў.

Школы маладога лектара набылі пэўны вопыт работы. Так, плённа вырашаюць пытанні навучання лектарскаму майстэрству студэнтаў у інстытуце народнай гаспадаркі імя В. У. Куйбышава. Вопыт работы гэтай школы абагульнены ў спецыяльнай брашуры. Паспяхова працуюць ШМЛ у Белдзяржуніверсітэце імя У. І. Леніна, медыцынскім інстытуце, інстытуце механізацыі сельскай гаспадаркі.

Практыка паказвае, што школы маладога лектара больш паспяхова працуюць там, дзе рэктараты, партыйныя камітэты ВНУ ўдзяляюць ім пастаянную ўвагу, дзе асабіста лектары, сакратары партыйных камітэтаў сустракаюцца са слухачамі, выступаюць перад імі. Пытанні, звязаныя з работа ШМЛ, сістэматычна абмяркоўваюцца на пасяджэннях партыйных камітэтаў Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна, медыцынскага інстытута, Мінскай вышэйшай школы МУС СССР, інстытута фізічнай культуры.

Аднак змест работы па падрыхтоўцы маладых лектараў, пытанні камплектавання школ слухачамі ўсё яшчэ патрабуюць значнага паляпшэння. Мэтанакіравана, каб слухачамі школы маладога лектара станавіліся студэнты 2-га і 3-га курсаў. Практыка залічэння студэнтаў 1-га курса слухачамі сябе не апраўдвае. Набор у школу праводзіцца па рэкамендацыі камсамольскіх арганізацый загадам рэктара ВНУ. Камсамольскія арганізацыі разглядаюць навучанне ў іх як адказнае камсамольскае даручэнне.

У мэтах паляпшэння падрыхтоўкі лектараў важнае значэнне мае чытанне кваліфікаваных лекцый па курсу «Асновы лектарскага майстэрства». На лекцыйныя і практычныя заняткі па гэтаму курсу адводзіцца ўвесь першы год навучання ў школе. На другім годзе навучання неабходна развіваць навыкі вуснай мовы. Асабліве месца павінна заняць падрыхтоўка рэферата, тэкста лекцыі па выбранай тэме ў сваёй секцыі, выступленне слухачоў у маладзёжнай аўдыторыі — школе, ВНУ, працоўным калектыве. У вырашэнні ўсіх гэтых пытанняў асабліва вялікая роля настаўнікаў (або выкладчыкаў-кансультантаў), за якімі рашэннем кафедраў замацоўваецца на ўвесь перыяд навучання ў ШМЛ 5—8 слухачоў. Яны павінны весці з імі сістэматычную, планавую работу па выкананню практычных заданняў па падрыхтоўцы лекцый.

Больш увагі неабходна ўдзяліць і арганізацыі практыкі маладых лектараў. Цікавая і заслугоўвае распаўсюджвання ў гэтых адносінах ініцыятыва медыцынскага інстытута. Тут факультэт грамадскіх прафесій распрацаваў два цыклы лекцый па профілю ВНУ і прапанаваў іх студэнтам для прачытання ў старэйшых класах сярэдніх школ горада. Гарадскі аддзел народнай асветы і праўленне гарадской арганізацыі таварыства «Веды» падтрымалі гэту прапанову.

Дапамагчы студэнтам, якія паспяхова скончылі школы маладога лектара, у падрыхтоўцы і правядзенні выступленняў у маладзёжных аўдыторыях з тым, каб яны яшчэ да завяршэння вучобы ў ВНУ маглі быць прыняты ў рады таварыства «Веды»,— адна з задач саветаў школ, камсамольскіх камітэтаў.

Далейшае ўдасканаленне работы школ маладога лектара дасць магчымасць папоўніць рады ідэалагічных байцоў нашай партыі, развіваць грамадска-палітычную актыўнасць студэнтаў, прыцягнуць іх да актыўнага ўдзелу ў растлумачэнні важнейшых партыйных дакументаў.

М. ГЛУХАРАЎ.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Мінская паліграфічная фабрыка «Красная звезда» МВПА імя Я. Коласа.

13 лютага 1986 г.
Зак. 98. АТ 07085.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 72-73.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЁЎ.